# Тэндэнцыі рэлігійнага жыцця беларускіх татар 1945–1985 гг.

**Мазец Валянцін Генрыхавіч,**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

У артыкуле адлюстраваны змены ў рэлігійным жыцці беларускіх татар на працягу 40 пасляваенных гадоў.

У першыя пасляваенныя месяцы ў месцах кампактнага пражывання беларускіх татар дзейнічала 13 мусульманскіх абшчын [1, с. 262]. Адной з першых была зарэгістравана 26 сакавіка 1945 г. абшчына татар-мусульман у Мінску ў колькасці 204 чалавек на чале з 53-гадовым мулой Мустафой Хасяневічам. У чэрвені 1945 г дзейнічалі таксама мячэці у Клецку на чале з мулой Мустафой Александровічам, і ў мястэчку Мір, якую узначальваў Мустафа Муха. Без рэгістрацыі дзейнічала мячэць у Навагрудку, дзе мулой быў Селім Сафаровіч. Тут абшчына была самай шматлікай і налічвала каля 1000 чалавек. Выезд большай часткі мусульманскай абшчыны Навагрудка на пастаяннае месца жыхарства ў Польшчу ў 1946 г. стаў падставай для ліквідацыі гэтай абшчыны і закрыцці мячэці. Так, рашэннем Баранавіцкага аблвыканкама 25 сакавіка 1948 г. абшчына ў Навагрудку была ліквідавана, а мячэць закрыта і неўзабаве пераабсталявана пад Дом піянераў. У ліпені 1949 г Мінгарвыканкам прыняў рашэнне пра ліквідацыю абшчыны татар-мусульман і закрыцці мячэці. Нягледзячы на зварот 163 вернікаў да Сталіна, татары-мусульмане Мінска былі пазбаўлены сваёй святыні, якая была перададзена ў верасні 1949 г Рэспубліканскаму добраахвотнаму таварыству садзейнічання флоту [1, с. 262].

Богаслужэнні ў Асмолаўскай мячэці ў першыя пасляваенныя гады праводзіў без рэгістрацыі мула Юсуф Халембік. Татара-мусульманская абшчына ў Асмолаве была зарэгістраваная 9 снежня 1946 г. і аб'ядноўвала каля 500 чалавек. Разам з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тым, колькасць мусульманскай абшчыны ў в. Асмолава істотна скарацілася пасля ад'езду татараў у Польшчу: з 500 у 1945 г. да 46 у 1947 г. У гутарцы з Упаўнаважаным Савета па справах рэлігійных культаў па Баранавіцкай вобласці Івановым мула Асмолаўскай абшчыны Мустафа Александровіч расказаў, што "цяпер татары ў пераважнай большасці не знаюць сваёй пісьменнасці і нават многія з іх не могуць размаўляць па-татарску, але і пры гэтых умовах яны ўсё-ж такі захавалі сваю рэлігію. Захаванню рэлігіі садзейнічала наяўнасць у абшчынах мулл і існаванне муфціі." [2, арк. 48].

Захаваліся мячэці таксама ў Любчы і Слоніме, але там не было мулы.

У 1947 г. працавала без мулы мячэць у г. Ляхавічах. Багаслужэнні там праводзілі прадстаўнікі мясцовай мусульманскай абшчыны: Адам Міцкевіч, Давід Мурзіч і Ібрагім Рафаловіч. Без рэгістрацыі дзейнічалі ў 1947 г. абшчыны татар-мусульман у Мядзелі і Іўі.

У вёсцы Некрашунцы Радунскага раёна да 1946 г. дзейнічала рэлігійная абшчына татар-мусульман, якая аб'ядноўвала татарскае насельніцтва не толькі Радуньскага раёна Гродзенскай вобласці, але і з памежных тэрыторый Літвы. Там жа захаваўся і будынак мячэці. Але ў сувязі з выездам у 1946 г. у Польшчу значнай часткі татарскага насельніцтва і мулы Люта Мухлі, які лічыў сябе, паводле нацыянальнасці, польскім татарынам, мусульманская абшчына перастала функцыянаваць, а мячэць была закрыта. Да 1953 г. у Некрашунцах заставалася 31 сям'я татар, а ў суседняй Сандыкаўшчыне – 13 сем'яў. Нягледзячы на тое, што арганізаванага правядзення богаслужэнняў у гэтых месцах не праводзілася, татарскае насельніцтва падтрымлівала і выконвала "Уразу", святкавалі "Байрам", па пятніцах не працавалі і выконвалі ўсе іншыя рэлігійныя абрады ў адпаведнасці з патрабаваннямі Карана [3, арк.207].

Паводле звестак Упаўнаважанага па Маладзечанскай вобласці Дзерабіна, у 1949 г. татары-мусульмане дадзенай вобласці сваёй нацыянальнай мовы не ведалі, размаўлялі на змешанай польскай, беларускай і рускай. Рэлігійная абшчына ў вёсцы Даўбуцішкі аб'ядноўвала 75 татарскіх сем'яў Смаргонскага, Валожынскага, Ашмянскага і Астравецкага раёнаў і налічвала каля 300 чалавек. У Мядзельскім раёне жыло 60 сем'яў татар колькасцю 248 чалавек, а ў мястэчку Іўе жыло 75 татарскіх сямей колькасцю 343 чалавекі.

У пачатку 1953 г. функцыянавалі 2 зарэгістраваныя мусульманскія абшчыны: у вёсцы Асмолава Нясвіжскага раёна і ў в. Мураўшчызна Іўеўскага раёна. Акрамя іх дзейнічалі дзве незарэгістраваныя мусульманскія абшчыны ў в. Даўбуцішкі Смаргонскага раёна і ў в. Некрашунцы Радунскага раёна. Да 1953 г. у вёсцы Даўбуцішкі засталося толькі 14 татарскіх сем'яў. На старажытных татарскіх могілках знаходзілася невялікая драўляная мячэць. У гэтай мячэці рэгулярна праводзіў багаслужэнні мула Алій Рафаловіч, які ў 1948 г. атрымаў дазвол на правядзенне разавых богаслужэнняў. Смаргонскі райфінаддзел устанавіў для Рафаловіча падатак як для зарэгістраванага служыцеля культа. Кіруючыся рашэннем райфінаддзела, мула лічыў зарэгістраванай абшчыну, якая аб'ядноўвала каля 200 вернікаў з 98 сямей татар-мусульман Смаргонскага, Валожынскага і Ашмянскага раёнаў. Праўда актыўнасць вернікаў была не вельмі высокай. Так па пятніцах мячэць наведвалі не больш 10–15 чалавек, а на свяце "Ураза-байрам" у 1953 г. было 70 вернікаў-мусульман [3, с. 205]. Разам з тым, Упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР па Маладзечанскай вобласці Кліманскі прапанаваў А. Рафаловічу не праводзіць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

багаслужэнні да атрымання на гэта афіцыйнага дазволу, які ўладамі так і не быў дадзены [4, арк.53].

Рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных 15 сакавіка 1960 г. была пазбаўлена рэгістрацыі мусульманская абшчына ў вёсцы Асмолава Нясвіжскага раёна, якая Падставай для прыняцця гэтага рашэння з'явілася скарачэнне колькаснага складу абшчыны з 95 чалавек на момант рэгістрацыі да 10-17 вернікаў – у 1960 г. Акрамя гэтага, у 1953 г. адмовіўся выконваць свае абавязкі мула Мустафа Александровіч. Па стану на 1-га ліпеня 1960 г. ў БССР дзейнічала толькі адна зарэгістраваная мусульманская абшчына ў в. Мураўшчызна Іўеўскага раёна, абавязкі мулы ў якой выконваў Мустафа Шабановіч [5, арк. 53].

Сітуацыя заставалася нязменнай і ў наступныя дзесяцігоддзі. Так, па стану на 1 студзеня 1965 г. у рэспубліцы была зарэгістраваная адна мячэць, адзін мула, а колькасць вернікаў была каля 250 чалавек [6, арк. 2]. Упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР па БССР Адам Залескі адзначаў: "Істотных асаблівасцяў у дзейнасці мусульманскага рэлігійнага аб'яднання, зарэгістраванага ў в. Мураўшчызна Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці ў 1976 г не назіралася… Моладзь амаль пагалоўна адыйшла ад мусульманскіх традыцый і звычаяў" [7, арк.59]. Богаслужэнні па пятніцах ў мячэці наведвала ад 40 да 60 чалавек. На вялікія рэлігійныя мусульманскія святы збіралася ад 200 да 400 вернікаў з шэрагу раёнаў Гродзенскай і Мінскай абласцей, а таксама з Мінска.

Пэўнае ажыўленне нацыянальна-рэлігійнага жыцця беларускіх татар назіраецца з пачатку 80-х гг XX ст. На малітоўным сходзе мусульман у г. п. Іўе, якое праходзіла 24 снежня 1982 г., у мячэці прысутнічала 7 мужчын і 10 жанчын. Багаслужэнне праводзіў мула Мустафа Шабановіч. На пытанне "Як Вы чытаеце і разумееце Каран?", зададзенае старшым інспектарам В. Берняковічам, мула адказаў: "Нас гэтаму вучылі нашыя бацькі. Чытаць па арабску мы можам толькі пры дапамозе спецыяльных сімвалаў-значкоў". М.Шабановіч падкрэсліў, што чытаць па арабску ўмее не толькі ён, але і іншыя вернікі, якія таксама маюць Каран. Мула таксама выказаў шкадаванне, што моладзь не жадае вучыцца чытаць Каран і ўдзельнічаць у маленнях, наведваючы мячэць толькі ў час асноўных рэлігійных святаў. Адной з прычынаў адыходу татарскай моладзі ад сваіх нацыянальна-рэлігійных традыцый было заключэнне шлюбаў з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў. У самога мулы Шабановіча сын і ўнук былі жанаты не на прадстаўніцах сваёй нацыянальнасці [8, арк. 83].

Без рэгістрацыі дзейнічаў мула А. Рафаловіч, які на працягу 1983 г. праводзіў пахаванне нябожчыкаў паводле мусульманскіх традыцый не толькі ў Навагрудку, але і ў Клецкім раёне Мінскай вобласці, а таксама збіраў у сябе дома вернікаў для правядзення багаслужэння [9, арк. 154].

Такім чынам, на працягу разглядаемага перыяду адбылося істотнае скарачэнне колькасці зарэгістраваных мусульманскіх абшчын беларускіх татар, якое было абумоўлена мэтанакіраванай палітыкай дзяржавы ў рэлігійнай сферы.

**Літаратура**

1. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава ; навук. рэд. У.І. Навіцкі – Мн. : ВП "Экаперспектыва", 1998. – 340 с.
2. НА РБ. Ф. 952. Воп.2. Спр. 10.
3. НА РБ. Ф.4-п. Воп.62. Спр. 348.
4. НА РБ. Ф.952. Воп.2. Спр. 24.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. НА РБ. Ф. 952. Воп.3. Спр.17. Арк. 53
6. НА РБ. Ф. 952. Воп.3. Спр.40. Арк. 2
7. НА РБ. Ф.4-п. Воп.118. Спр. 11. Арк. 59
8. НА РБ. Ф.136. Воп.1. Спр.71. Арк. 83
9. НА РБ. Ф.136. Воп.1. Спр.76. Арк. 154
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова